Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЛЮТАГА 2024 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 40 (30174)

На 20.00 25 лютага ў адзіным дні галасавання прынялі ўдзел 72,98 % выбаршчыкаў

На момант закрыцця выбарчых участкаў у Брэсцкай вобласці прагаласавалі 75,82 % выбаршчыкаў, у Віцебскай — 74,74 %, Гомельскай — 75,85 %. На Гродзеншчыне ў выбарах прынялі ўдзел 76,90 % грамадзян, на Міншчыне — 74,20 %. Яўка па Магілёўскай вобласці склала 77,03 %. У Мінску свой выбар ажыццявілі 61,54 % грамадзян, якія ўдзельнічаюць у галасаванні.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЫ ПРАВОДЗІМ ШЧЫРУЮ, СУМЛЕННУЮ ПАЛІТЫКУ І ТАКІЯ Ж ВЫБАРЫ»

За што галасуе Прэзідэнт, і да чаго трэба быць гатовым грамадству

Фота БелТА.

У адзіны дзень галасавання свой голас аддаў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Па традыцыі кіраўнік дзяржавы галасуе на ўчастку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры. Сёлета ўпершыню на выбарах прагаласаваў і малодшы сын Прэзідэнта Мікалай Лукашэнка. Па традыцыі пасля галасавання Аляксандр Лукашэнка адказвае на пытанні журналістаў. Як заўсёды, шчыра і адкрыта. Сярод удзельнікаў размовы былі прадстаўнікі не толькі беларускіх, але і замежных СМІ. Таму пытанні датычыліся не толькі ўнутранага парадку дня, але і падзей, якія разгортваюцца на знешнім контуры.

РОЛЯ ПАРЛАМЕНТА БУДЗЕ ПАВЫШАЦЦА

Першае пытанне, безумоўна, пра выбары ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы. Журналісты пацікавіліся, на чым заснаваны выбар кіраўніка дзяржавы. «Свой выбар я сёння заснаваў на прафесіяналізме і надзейнасці. У нас час няпросты наперадзе. Таму, акрамя прафесіяналізму, павінна быць надзейнасць і адданасць беларускаму народу», — адказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што 2024 год, аб'яўлены ў Беларусі Годам якасці, будзе вельмі актыўным. На гэта кіраўнік дзяржавы настройвае і грамадства, і ўсю вертыкаль улады, якая сумленна працавала, і будзе працаваць. Пры гэтым, як заўважыў беларускі лідар, цяпер не тыя часы, калі людзі натоўпам ішлі на прэзідэнцкія выбары ці выбары ў парламент. «Людзі пачынаюць разумець, што ў Беларусі, напрыклад, Прэзідэнт — гэта не цар, гэта не Бог, гэта вельмі цяжкая работа. І ўскінуць на сябе ў цяперашняй сітуацыі гэты груз нашай краіны не кожны вырашыцца. Гэтаксама і парламент, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Роля парламента будзе павышацца. Штомесяц, штогод. Частку паўнамоцтваў мы ўжо перадаем парламенту і іншым органам улады. Ідзе пэўная перабудова, пакаленні мяняюцца. Гэта асноўная прычына».

СТАР. 2-3

КАРАТКА

- **Нормы па ўключэнні ацяплення змянілі ў Беларусі.**
- Высокадакладны апарат КТ устанавілі ў Мазырскім анкадыспансеры.
- **Беларускі фонд міру прысвоіў статус школы міру 170 установам.**
- Мінбудархітэктуры: у гэтым годзе жылля з дзяржпадтрымкай будзе пабудавана амаль на 400 тысяч квадратных метраў больш.
- **Мінадукацыі абнавіла Палажэнне аб установе дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі.**
- Інтэрактыўную залу «Цікавыя рэчы Сярэднявечча» адкрылі ў Лідскім замку.
- **Падтопленні талымі водамі фіксуюцца ў Гомельскай вобласці.**
- Спецыялістаў у галіне харчовых біятэхналогій і здаровага харчавання будуць рыхтаваць у Магілёве.

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 24040

ВЫБАР ДЗЕЛЯ НОВЫХ ПАКАЛЕННЯЎ

Фота Вітара ІВАНЮКАВА.

Механік ААТ «Трэст Шахтаспецбуд» Сяргей ІВАНЮК з Салігорска і яго жонка Наталля, якая працуе страхавым агентам у закрытым акцыянерным страхавым таварыстве «Белнафтастрах», разам з сямігадовай дачкой Арыянай прыйшлі на адзіны дзень галасавання. Дачку ўзялі з сабой нездарма, бо вызначаюць не толькі сваю, але і яе будучыню.

«МЫ ПРАВОДЗІМ ШЧЫРУЮ, СУМЛЕННУЮ ПАЛІТЫКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка ўзгадаў нядаўнія словы кіраўніка Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігара Карпенкі, які сказаў: калі хтосьці хоча шоу на выбарах, трэба ісці ў цырк. «Гэта вельмі сур'ёзнае мерапрыемства. Асабліва ў момант мадэрнізацыі нашай улады. Нас могуць пакрытыкаваць: нейкая слабая мадэрнізацыя. Але мы заўсёды казалі, што ўсюды ўсе працэсы павінны мець эвалюцыйны характар. Калі пайсці рэзка — таксама можна цяпер, але гэта рэвалюцыя. Ліміт рэвалюцый мы і расіяне ўжо вычарпалі. Да чаго гэта можа прывесці — Украіна. Яны таксама ліміт вычарпалі, але паспрабавалі ў 2014—2015 годзе, майданулі. Вось да чаго прывялі гэтыя рэзкія павароты. Таму мы спакойна ідзём, мадэрнізуючы сваю сістэму. Але трэба зрабіць, каб яна ўстаканілася, па-народнаму гаворачы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

ВЫБАРЫ — НАЙПЕРШ ДЛЯ НАРОДА

Журналісты не пакінулі без увагі і тое, што на гэтых выбарах няма назіральнікаў ад АБСЕ. «Усе, хто прасіўся да нас прыехаць, — мы нікому не адмовілі. Калі б АБСЕ захацела да нас прыехаць і зрабіла такі запыт, — мы б яго разгледзелі, хутчэй за ўсё, станоўча. Яны не прасіліся, але чаму мы паўзці да іх павінны? Гэта нашы выбары, для нас», — пракаментаваў гэта Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, вынік запрашэння назіральнікаў з АБСЕ быў бы відавочным. Ён нагадаў, як раней на беларускіх выбарах працавалі назіральнікі з АБСЕ: «Яны загадзя падрыхтавалі пратакол — заключэнне. І згубілі. Нашы хлопцы знайшлі, сфатаграфавалі і мне на стол. Слухайце, два дні да выбараў, папярэдняе галасаванне ідзе — яны ўжо пераклеслілі нашы выбары. Ну навошта іх сюды клікаць? А пасля выбараў адзін у адзін была агучаная тая першапачатковая нарыхтоўка». Прэзідэнт задаў рытарычнае пытанне: які сэнс іх сюды запрашаць? Таму і не запрашаюць. «Але, калі б яны захацелі пабываць у нас на выбарах, папрасілі мандат адпаведны, мы б яго разгледзелі, і, упэўнены, мы прынялі б іх просьбу, — заявіў Прэзідэнт. — Пакуль жа яшчэ не позна. Галоўнае ж — лічыць, яны кажуць. Няхай прыязджаюць да вечара. Вось я іх усіх без віз запушчу ў Беларусь. Захочуць — няхай прыязджаюць. Пасля выбараў няхай прыедуць. Дасведчаныя людзі ўбачаць абстаноўку і могуць суаднесці вынікі выбараў з той рэчаіснасцю, якая будзе складвацца пасля выбараў».

Свае пытанні Прэзідэнту задалі і журналісты з турэцкіх СМІ. Яны адзначылі добрую арганізацыю выбараў у Беларусі, свабоднае і спакойнае галасаванне. Яны пацікавіліся, як Аляксандр Лукашэнка ставіцца да таго, што Захад называе выбары ў Беларусі і некаторых іншых краінах (напрыклад, Турцыі, Расіі, Іране) недэмакратычнымі. «Туркі праводзяць выбары для турэцкага народа, беларусы — для беларускага, расіяне, кітайцы — для сваіх народаў. І мы будзем рабіць так, як выгадна нашым людзям. Выбары пакажуць. Любыя выбары, у тым ліку нашы «недэмакратычныя», адкажуць на многія пытанні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што выбары ў Беларусі праходзяць вельмі спакойна, няма сутыкненняў, намераў на іх, мяцяжоў, як гэта было раней. «Мы ўмеем рабіць высновы са сваіх памылак. Мы бачым свае памылкі і робім адпаведныя высновы», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар задаў турэцкаму журналісту рытарычнае пытанне наконт прызнання выбараў у Турцыі: «Вам гэта вельмі трэба? Ну прызнаюць яны вас. Ну калі Турцыя развяжа вайну на Блізкім Усходзе і яшчэ на Ізраіль пойдзе (не дай бог, вядома) — вось гэта будзе для іх мілата. Абмежаваныя канфлікты па ўсім свеце ў розных пунктах — гэта тое, чаго яны жадаюць. Тады пра шматпалярнасць менш будуць казаць, застанецца аднапалярны свет, і амерыканцы, як раней было, як жандармы, закасаўшы рукавы (рукі па локці ў крыві), будуць расхаджваць па ўсёй планеце. Толькі турэцкаму, беларускаму і іншым народам гэта не трэба. Яны на Захадзе хочуць вырашаць пытанні, як ва Украіне, чужымі рукамі», — сказаў беларускі лідар. Ён прывёў у прыклад Украіну, якая, па яго словах, «дэмакратычная далей няма куды». «Чаго дабілася Украіна? — задаў рытарычнае пытанне Аляксандр Лукашэнка. І гэтыя звар'яцелыя, асабліва еўрапейцы (ладна, амерыканцы — зразумела, чаго яны жадаюць, але гэтыя чаго падвякваюць?), кажуць, што ва Украіне сапраўдная дэмакратыя. Вам патрэбна такая дэмакратыя, як ва Украіне? Нам не патрэбна. Нікому не патрэбна вайна. Вось да чаго прывяла іх дэмакратыя. Яны даўно забыліся, што такое дэмакратыя і свабода. Таму трэба супакоіцца і рабіць сваю справу. Рабіць усё гэта ў інтарэсах уласнага народа».

Вяртаючыся да асноўнай тэмы пытання, Прэзідэнт заявіў, што нідзе ў свеце такіх адкрытых, сумленных, рынцыповых выбараў, як у Беларусі, няма. «У нас гэта свята. Так было заўсёды. І калі ў савецкі час неяк фальшывілі — усё было, але было без душы — у нас гэта душэўна ўсё праходзіць. Таму мы праводзім шчырую, сумленную палітыку і такія ж выбары. Нам не патрэбны ні войны, ні сутыкненні. Нам патрэбна спакойнае жыццё. А ў імя гэтага мы будзем рабіць усё», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дрыжачымі рукамі ўладу не трымаюць і ніхто нікому ўладу не аддасць і не падорыць, але гэта павінна быць заснавана на даверы народа да гэтай улады. «Я лічу, што ў нас сёння ў пераважнай большасці народ уладзе давярае. Хоць і крытыкуе. Гэта нармальна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«ЧЫМ СКЛАДАНЕЙШАЯ БУДЗЕ АБСТАНОЎКА, ТЫМ ХУТЧЭЙ Я ПАЙДУ НА ВЫБАРЫ»

У гэты дзень журналісты не маглі не спытаць, ці пойдзе Аляксандр Лукашэнка на наступныя прэзідэнцкія выбары, якія пройдуць у Беларусі ў 2025 годзе. «Пайду, — адказаў ён. — Перадайце ім (збеглым), што пайду. І чым складанейшая будзе абстаноўка, чым больш актыўна яны будуць бударажыць наша грамадства і вас у тым ліку (для мяне, паверце, гэта вельмі важна — ніводны чалавек, адказны Прэзідэнт не кіне сваіх людзей, якія за ім ішлі ў бой), чым яны будуць больш напружваць вас, мяне і грамадства, тым хутчэй я пайду на гэтыя выбары. Вы не хвалюйцеся, мы зробім так, як гэта патрэбна для Беларусі».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, ён ведае, што некаторыя чыноўнікі яго не любяць, крытыкуюць за тое, што жорстка пытае за выкананне дамоўленасцяў і прынятых Прэзідэнтам рашэнняў. «Калі яны не будуць выконвацца, тады абрынецца ўся канструкцыя ўлады і грамадства патоне. Так, я гэта разумею. Напэўна, і журналістам я не ўсім падабаюся з-за свайго характару і іншае. Але добра ў тым, што журналісты, а потым і грамадства дзякуючы журналістам пачынаюць разумець: вось Лукашэнка там нешта сказаў, жорстка запатрабаваў — аказалася, ён мае рацыю», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы прывёў у прыклад пандэмію каранавіруса: калі беларускі падыход да барацьбы з хваробай прынялі не адразу, але потым пагадзіліся, што рашэнні кіраўніка дзяржавы былі самымі аптымальнымі. У краіне не зачынялі заводы і прадпрыемствы, не ўводзілі лакдаўн, што адлюстравалася на эканамічных паказчыках.

«Гэта мая работа: сядзець, думаць, і, выкарыстаўшы вопыт і свае веды, я павінен прагназаваць. Калі гэтага ў Прэзідэнта няма, няма чаго гэтым і займацца. Таму гэта галоўная якасць Прэзідэнта. Натуральна, павінна быць жалезная інтуіцыя. А самае галоўнае — ты заўсёды павінен памятаць, адкуль ты прыйшоў, быць зямным чалавекам. Памятаць, што 10 мільёнаў чалавек і мільёны тры, якія сюды прыязджаюць адпачываць, — гэта людзі, якім ты павінен. Ты ім абавязаны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«ЦЯПЕРАШНІ СВЕТ — ГЭТА СІЛА, РАЗУМЕЮЦЬ ТОЛЬКІ СІЛУ»

Прадстаўнікі СМІ вярнуліся да нарады Прэзідэнта з кіраўніцтвам сілавога блока, якая прайшла 20 лютага. Тады Аляксандр Лукашэнка агучыў тры сцэнарыі, якія могуць ажыццявіць збеглыя па захопу ўлады ў краіне. Журналісты пацікавіліся, што Беларусь можа супрацьпаставіць апанентам, каб не дапусціць рэалізацыі гэтых сцэнарыяў. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на трэці сцэнар — гульню ўдоўгую. «Усё роўна, удоўгую яны будуць гуляць ці ў кароткую, мэта адна — трэба Беларусь развярнуць у зваротным кірунку, а для таго, каб яе развярнуць, трэба звергнуць цяперашнюю ўладу. Гэта будзе вельмі складана. Асабліва пасля, я ўпэўнены, адзінага дня галасавання і нашых выбараў. Таму што выбіраем мы абсалютна надзейных, талковых людзей, якія разумеюць задачы, што стаяць перад нашым народам. Таму ні адзін з варыянтаў, нават самы радыкальны, у іх не пройдзе ў Беларусі. Мы ўмеем рабіць высновы са сваіх былых памылак, таму спадзявацца ім няма на што. Але будуць спрабаваць, будуць хістаць», — адказаў Прэзідэнт. І ён растлумачыў, чаму: «Яны сябе лічаць моцнымі, шчокі надзьмулі, надзьмуліся: «Такія мы вялікія. А тут нейкая Беларусь, трэба яе растаптаць і бліжэй пасунуцца наперад, на Усход, да рэсурсаў, бліжэй да Масквы. Мы гэта разумеем». Аляксандр Лукашэнка расказаў, што разам з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным разглядалі розныя варыянты развіцця падзей і супрацьдзеяння ім. «Мы заўсёды будзем адзіныя з Расіяй. У такой сітуацыі мы супрацьстаяць можам любому саперніку, — заявіў ён. — Цяперашні свет — гэта сіла, разумеюць толькі сілу. Калі мы, прабачце мне, соплі распусцім і будзем змагацца за дэмакратыю і нейкую эфемерную свабоду, — вы ўбачылі, якая ў іх «дэмакратыя»... Таму нам трэба бачыць свае мэты, свае інтарэсы, быць шчырымі, праводзіць палітыку справядлівасці. Тады гэта будзе адзінства нашага народа. Не без таго што хтосьці выпаўзе з-пад плінтуса, вякне, але гэта ў любым грамадстве бывае. Таму ўсе гэтыя сцэнарыі нерэалізавальныя. Мы гэта ўсё выдатна бачым. Можаце нават не хвалявацца».

БЕЗ АРМЕНІІ АДКБ НЕ РУХНЕ

На гэтым тыдні прэм'-ер-міністр Арменіі Нікол Пашынян заявіў аб замарозцы членства яго краіны ў Арганізацыі Дагавора калектыўнай бяспекі. Журналісты пацікавіліся, як гэта паўплывае на бяспеку ў рэгіёне. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што іншыя члены АДКБ рэагуюць на такія заявы абсалютна спакойна. «Трэба быць Арменіі ў АДКБ — мы нікога не выганяем, заўсёды падтрымлівалі, і падтрымліваем, і будзем падтрымліваць як свайго саюзніка. Не захочуць яны быць у АДКБ — АДКБ не рухне», — сказаў беларускі лідар. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што ніякіх афіцыйных заяў аб выхадзе Арменіі з АДКБ з Ерэвана ў арганізацыю не паступала.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Арменіі не такая сістэма ўлады як у Беларусі. Сам Нікол Пашынян не можа вырашаць, выходзіць краіне з АДКБ ці не. Такія рашэнні прымае парламент. «Думаю, разважных людзей у парламенце Арменіі большасць. Крыўдаў ніякіх на нас быць не можа, на АДКБ», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што і Азербайджан для членаў АДКБ не чужая краіна. У арганізацыі нямала мусульманскіх краін, адсюль збольшага адпаведная пазіцыя. «А Арменія, што, хацела, каб мы ўцягнуліся ў вайну Арменіі з Азербайджанам? Дык да гэтага часу б ішла гэтая вайна, і загінулі б тысячы людзей. Я лічу, што Азербайджан і Арменія, на жаль, праз вайну ў выніку прыйшлі да правільнага вырашэння пытання. Арменія (і яны гэта прызналі) акупіравала пяць ці шэсць раёнаў азербайджанскіх», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што раней фактычна быў пасярэднікам паміж Баку і Ерэванам у спробе мірна ўрэгуляваць тэрытарыяльную спрэчку. Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў шмат гадоў не толькі заклікаў да мірнага ўрэгулявання канфлікту, але і прапаноўваў фінансавую падтрымку армянскаму боку. Прапаноўвалася нават укладанне мільярдных інвестыцый у эканоміку Арменіі. Было вельмі шмат прапаноў па-добраму вырашыць гэтае пытанне. Але былое кіраўніцтва Арменіі не ішло на мірнае ўрэгуляванне, і праблемы назапашваліся, абрынуліся на Нікола Пашыняна, на яго ўрад. «Ён наогул мала вінаваты ў тым, што адбылося. Але гэтую праблему трэба было вырашаць. Тым больш што акупаваныя Арменіяй раёны азербайджанскія — гэта пустыня была. У самым прыгожым месцы, у цёплым, утульным, дзе маглі жыць людзі. Больш за мільён бежанцаў азербайджанскіх — вялікі груз на Азербайджане, і многія іншыя праблемы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што армяне — блізкія, нашы родныя людзі. Але, па яго словах, і Азербайджан не чужая краіна. «Таму мы трапілі ў такую сітуацыю. І там не было прычын уступлення АДКБ у гэты канфлікт. Абсалютна не было для нас нагоды нават», — падкрэсліў беларускі лідар.

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на цесныя кантакты Арменіі і Францыі. Ужо была заява наконт таго, што Францыя дапаможа Арменіі і сістэмамі СПА, і ў ваеннай галіне, і ў эканоміцы. «Увогуле, возьме Ерэван на плечы і панясе, — іранічна заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Ніхто нікога не панясе. Вы бачыце, што адбываецца ў Францыі. Таму палітыкам у Ерэване трэба ачуняць і, па-народнаму кажучы, не трэба губляць тое, што ёсць», — параіў Прэзідэнт. Ён прывёў у прыклад Грузію: «Дзякуй богу, устанаўліваюцца нармальныя адносіны перш за ўсё з Расіяй, з намі, эканоміка паднімаецца. Пакаштавалі лёгкага хлеба на Захадзе. Амерыканцы ўжо пра Грузію забыліся. Як толькі грузіны варухнуліся ў тым плане, што гэта іх краіна незалежная і суверэнная, Захад пачаў на іх ціснуць. У тым ліку і перш за ўсё ЗША. Ну дык трэба зрабіць адпаведную выснову. Нікому яны на Захадзе не патрэбныя. Там тысячы праблем». Па яго словах, сённяшняе кіраўніцтва, напрыклад ЗША, падтрымлівае Украіну, Арменію і гэтак далей. Але калі ўлада зменіцца, то падыходы могуць змяніцца кардынальным чынам.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў не губляць тое, што трымаеш у руках: «Выйсці проста, а вось зайсці будзе складана. Прыклад зноў жа — Грузія. Ну, выйшла яна з СНД і ўсіх структур. Што гэта, лепш для яе? Не. Пажадана вярнуцца. А вярнуцца заўсёды складаней. Тут і страта твару, і іншае». Беларускі лідар параіў арменскаму боку не спяшацца і не рабіць рэзкіх рухаў. «Не спяшайцеся. Не трэба выходзіць, не трэба замарожваць чагосьці. Ну калі вам нешта не падабаецца, ну не прыехалі, — сказаў ён. — Час многае мяняе. І сітуацыя зменіцца вакол Арменіі, Азербайджана. Наогул у свеце зменіцца. Таму такім кампактным невялікім дзяржавам, як Арменія, Беларусь і іншым, не трэба рабіць рэзкіх рухаў. Тонкі лёд — правалімся, не дастане ніхто. Наадварот, нагой пхнуць, каб там і захлынуўся. Не трэба спяшацца армянам. Мне здаецца, што Нікол Вавaевіч проста паспяшаўся і зрабіў эмацыянальную заяву», — сказаў ён.

БЯСПЕКА ДЛЯ БЕЛАРУСІ І РАСІІ — ГЭТА СВЯТОЕ

У працяг міжнароднай тэматыкі Аляксандр Лукашэнка выказаўся наконт адносін Беларусі і Расіі, аб перспектывах Саюзнай дзяржавы. Ён нагадаў, што ў адносінах дзвюх краін былі розныя моманты, часам нават напружаныя. «Я яшчэ да пачатку канфлікту ва Украіне і іншага, казаў, што ў эканоміцы можа быць усё, у дыпламатыі, палітыцы мы можам сварыцца. Але бяспека — гэта святое», — узгадаў Аляксандр Лукашэнка свае словы, сказаныя некалькі гадоў таму. Тады ж было сказана, што наступіць час, калі Беларусь і Расія будуць стаяць спіна да спіны і абараняцца. Ён расказаў, што тады ў Расіі гэта прынялі некалькі скептычна, маўляў, хапае магчымасцяў, каб сябе абараніць. «Гэта было сказана мне ў вочы. Я спакойна гэта перанёс. Як гісторык вам кажу: самыя вострыя пытанні вырашаліся тут, у эпіцэнтры была Беларусь. Што змянілася? Нічога. І тады я палітыкаў Расіі пра гэта папярэджваў. Гэта, можа, пяць, можа, сем гадоў таму было», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што на постсавецкай прасторы існуе некалькі міжнародных аб'яднанняў

І ТАКІЯ Ж ВЫБАРЫ»

з розным узроўнем інтэграцыі. Самае вялікае па колькасці — Садружнасць Незалежных Дзяржаў, галоўнае дасягненне якой — зона свабоднага гандлю. Больш прасунутая структура і Еўразійскі эканамічны саюз. Але найбольш глыбокая інтэграцыя і прыклад, у якім кірунку трэба рухацца, — гэта адносіны Беларусі і Расіі. Пры гэтым, як заўважыў беларускі лідар, яны застаюцца незалежнымі і суверэннымі дзяржавамі. Размовы кшталту «беларусы на каленях», «Беларусь стаіць перад Расіяй, заўтра ўключым у склад Расіі» ён назваў бессэнсоўнымі. «Гэта не трэба рабіць, гэта карысці не прынясе. Трэба step by step, крок за крокам, спакойна, эвалюцыйна вырашаць тыя праблемы, якія перад намі стаяць», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што з санкцыямі многія пытанні Саюзнай дзяржавы адпалі самі сабой. Беларуская прадукцыя стала больш запатрабаванай для суседзяў, і айчынныя вытворцы аказаліся больш прадстаўленымі на расійскім рынку. Беларусь можа быць карыснай для Расіі, напрыклад, у мікраэлектроніцы, а Расія, у сваю чаргу, дапамагла Беларусі ў энергетыцы. «Свет змяніўся, і мы сталі запатрабаванымі адно ў аднаго. Гэта значыць, праблема ёсць — вырашаем. Не трэба забягаць наперад», — адзначыў Прэзідэнт.

«Калі ў Расіі асабліва, ды і ў нас у Беларусі нехта думае, што Саюзная дзяржава — гэта заўтра аб'яднаемся, у Крамлі будзе ўлада і гэтак далей... Слухайце, я «Прэзідэнт, які сыходзіць» (я пра гэта часта кажу), але абсалютна перакананы: хто б ні прыйшоў пасля мяне, гэта пазіцыя падтрымана не будзе. Дзве суверэнныя, незалежныя дзяржавы. Мы разумныя, адукаваныя людзі, каб стварыць такое аб'яднанне суверэнных, незалежных дзяржаў, каб мы маглі быць мацнейшымі. Трэба спакойна ісці, вырашаць пытанні, якія ўзнікаюць», — перакананы беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў, што ЕАЭС можа пазычыць ад Саюзнай дзяржавы. «Што да зон свабоднага гандлю і ЕАЭС, то мы разглядаем усе заявы і прапановы. Іх нямала, вы бачыце, што і Іран, і арабскія краіны імкнуцца мець з намі зоны свабоднага гандлю, каб больш свабодна гандляваць. Таму мы адкрытыя для гэтага. Часам, бывае, і нейкія амбіцыі, абсалютна справядлівыя амбіцыі. Дапусцім, Кітай. Навошта мець там зону свабоднага гандлю, калі ёсць ШАС — больш шырокая арганізацыя, дзе можна было б мець такую зону свабоднага гандлю, як ЕАЭС, запазычыць гэта», — сказаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што ЕАЭС павінен запазычыць у першую чаргу адкрыццё граніц і поўную свабоду для перамяшчэння людзей, для рабочай сілы. У Саюзнай дзяржаве ніякіх фактараў стрымлівання няма, заўважыў ён. Кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што такім шляхам павінен ісці і ЕАЭС. Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў Саюзнай дзяржаве ёсць і палітычны, і дыпламатычны, і ваенны складальнік, чаго няма ў ЕАЭС.

ТРЭБА ІСЦІ НА ПЕРАГАВОРЫ, КАБ ЗАХАВАЦЬ УКРАІНУ

У размове журналістаў з Прэзідэнтам не абышлося і без пытанняў наконт сітуацыі ва Украіне. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што цяпер падстаў для мірнага ўрэгулявання канфлікту больш чым дастаткова. «Вы бачыце, як развіваюцца падзеі ва Украіне. І справа не толькі ў Аўдзееўцы. З Аўдзееўкай усё было б даўно вырашана, калі б расіяне ваявалі, як у Айчынную вайну, — сотні тысяч людзей кінулі, не важна, колькі загіне. Я ведаю дакладна, наколькі акуратна і асцярожна даводзіцца працаваць ваенным Расіі і Прэзідэнту Пуціну. Ён мне заўсёды кажа: «Шкада людзей. Маглі б хутчэй, але загіне вельмі шмат людзей». Справа не ў Аўдзееўцы, іншых пунктах, а справа ўся ў тым, што загіне шмат людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, расіяне вельмі сур'ёзна ўзялі курс на мірнае ўрэгуляванне гэтага канфлікту, асабліва цяпер. Не хочацца ў пекла кідаць людзей. Беларускі лідар выказаў меркаванне, што Украіна і яе саюзнікі, кіруючыся тым, што «мы вялікія і прайграць не можам», на мірнае ўрэгуляванне не пойдуць. «Хоць не так трэба ацэньваць. Не так гэта ўсё ацэньваецца. А рашучасцю народа і матэрыяльнымі рэсурсамі, рэзервамі. У каго больш? У Расіі. Яно ў зямлі ляжыць. А ў Амерыцы і Еўропе ёсць еўра і долар, якія яны друкуюць, але гэта ўсё абрынецца, гэта паперкі. А ў Расіі разгарнуўся ВПК, яны вырабляюць велізарную колькасць узбраенняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён параіў натаўцам падумаць, як потым Расія будзе выкарыстоўваць вялізную колькасць самых сучасных боепрыпасаў, іншага ўзбраення, якое цяпер вырабляе. «Думайце галавой. Спыніцеся зараз. Ёсць магчымасць дамовіцца. Дэнацыфікацыя, дэмілітарызацыя і іншае — гэта тэрміны. Гэта ўсё вырашаецца за сталом перагавораў. Гэта пакуль палітыка. Але калі Захад будзе так «дапамагаць» Украіне, як цяпер, то дні Украіны злічаныя. Гэта Валодзя Зяленскі павінен разумець як «Ойча наш», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што ўкраінскія ваенныя гэта разумеюць, яны бачаць, колькі людзей гіне. «Кідаюць непадрыхтаваных людзей, людзі ідуць, як на забой, разумеюць, што гэта білет у адзін бок. І вельмі-вельмі шмат такой інфармацыі», — сказаў беларускі лідар.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, калі ўкраінцы цяпер не пойдуць на перагаворы з Расіяй, яны поўнасцю страцяць краіну. «Як толькі пабягуць зараз украінскія салдаты або проста перастануць ваяваць, палякі заходнюю частку Украіны прыхопяць (што нам непрымальна, мы тут будзем на баку ўкраінцаў), а паўднёвую частку да Прыднястроўя Расія адрэжа. Што застанецца, адзін Кіеў?» — сказаў ён.

Прэзідэнт перакананы, што зараз трэба ісці на перагаворы, каб захаваць Украіну. «А далей... Пра гэта ўжо сказана, многія ведаюць (і на Захадзе), што расіяне пагадзіліся ўсходнія землі аддаць на разгляд будучым пакаленням — правядуць рэферэндум: захочае ва Украіне жыць — будзеце ва Украіне, у Расіі — у Расіі. Гэта адступленне. Крым ёсць Крым, гэта расійская зямля, расійская тэрыторыя, так лічаць расіяне. І Захад з гэтым таксама згодны», — сказаў ён. Таму, па словах Аляксандра Лукашэнкі, сёння, маючы мноства падстаў для мірных перагавораў, трэба рухацца ў гэтым кірунку.

Дарэчы, пакуль Прэзідэнт размаўляў з журналістамі, работа выбарчага ўчастка не спынялася. Студэнты, сем'і, пажылыя людзі прыходзілі ў БДУФК, каб аддаць свае галасы за кандыдатаў у дэпутаты.

Валерыя СЦЯЦКО.

Наталля КАЧАНАВА: «Прэзідэнт ставіць задачу быць блізкімі да людзей»

Фота БелТА.

«Рашэнне правесці выбары дэпутатаў усіх узроўняў у адзін дзень было правільным. На рэферэндуме ў 2022 годзе людзі аднагалосна падтрымалі змяненні ў Асноўны Закон, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Адна з навел якраз і датычылася адзінага дня галасавання. Гэтак жа сама будзе праводзіцца адна сесія ў год. Мы павінны працаваць больш аператыўна, больш хутка. Мы рады таму, што ў Канстытуцыю ўнеслі гэтыя навелы.

Па-першае, у электаральнай кампаніі заўсёды задзейнічана шмат людзей, гэта сур'ёзная работа і падрыхтоўка. Па-другое, калі будуць аднамомантна выбраны ўсе дэпутаты і яны аднамомантна пачнуць работу, якой будуць займацца на працягу пяці гадоў, — гэта правільна. Прэзідэнт ставіць задачу быць блізкімі да людзей, каб разумець, што тыя законы, якія мы прымаем, сапраўды працавалі на перспектыву, росквіт і развіццё нашай краіны.

Датэрміновае галасаванне паказала, што людзям цікавы фармат адзінага дня галасавання. Нашы грамадзяне актыўна сведчылі сваё волевыяўленне на датэрміновым галасаванні. Добрыя ацэнкі былі дадзеныя і міжнароднымі наглядальнікамі».

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА: «...Выбраць тых, хто сапраўды з'яўляецца патрыётам Беларусі»

Фота БелТА.

«Выбар дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — гэта, безумоўна, вельмі адказная справа, таму што за дэпутатам стаіць не проста пэўная колькасць яго выбаршчыкаў — 60—70 тысяч, але і ў цэлым гэта дэпутат, які будзе распрацоўваць законы, — звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — За ім стаіць краіна, ад яго залежыць яе развіццё, ён будзе адстойваць яе інтарэсы на міжнароднай арэне. Таксама гэта работа з выбаршчыкамі, прыняцце да ўвагі іх меркаванняў, пажаданняў, аказанне дапамогі ў развіцці рэгіёна. Калі гаварыць па вялікім рахунку, то ад таго, каго мы выберам сёння ў дэпутацкі корпус, залежыць будучыня нашай краіны і асабісты лёс кожнага беларуса.

Трэба выбраць тых, хто сапраўды з'яўляецца патрыётам Беларусі і хто сапраўды гэта даказаў, хто прафесіянал сваёй справы. У гэтым няпроста разабрацца, безумоўна, таму што на сёння шмат рознай інфармацыі, розныя фэйкі ідуць супраць кандыдатаў у дэпутаты. Таму трэба ўважліва падумаць, прафільтраваць гэту інфармацыю і прыняць правільнае рашэнне».

МІЖНАРОДНЫЯ НАЗІРАЛЬНІКІ: «ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ — СВЯТА ДЭМАКРАТЫІ»

Такую ацэнку выбарчай кампаніі даў міжнародны назіральнік ад Міжпарламенцкай Асамблеі СНД, член Камітэта Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па бюджэце і падатках Віктар СЕЛІВЁРСТАЎ. Ен заўважыў, што выбары ў нашай краіне праходзяць спакойна.

«Самае галоўнае, што мы ўбачылі, што выбары ў Беларусі — гэта свята, свята дэмакратыі, — падкрэсліў міжнародны назіральнік. — І, нягледзечы на беспрэцэдэнтныя размовы вакол беларускай і расійскай выбарчых кампаній, людзі ідуць галасаваць па сваёй волі. Вельмі добра сказаў старшыня ЦВК Беларусі: «Каму патрэбна шоу — ідзіце ў цырк». Я як чалавек, які на працягу многіх гадоў назірае за выбарамі, скажу, што ў Цэнтрвыбаркама Беларусі атрымалася зрабіць і свята, і вельмі высока арганізаваную прафесійную работу».

Віктар Селівёрстаў расказаў, што ў місію МПА СНД уваходзіць 25 дэпутатаў і сенатараў. У прадстаўнікоў місіі, па яго словах, сфарміраваўся толькі станоўчы погляд на тое, як адбываецца адзіны дзень галасавання ў Беларусі і якім чынам ён арганізаваны. «Малайцы, усё арганізавана добра, — канкрэтызаваў ён, звярнуўшы ўвагу на цудоўны настрой людзей. — Усё, што зроблена ў Беларусі з пункту гледжання фарміравання дэмакратычнай сістэмы выбараў, знаходзіцца на высокім узроўні».

Міжнародны назіральнік паведаміў, што ўважліва слухаў інтэрв'ю журналістам Аляксандра Лукашэнкі, які, па яго словах, абсалютна аб'ектыўна падкрэсліў, што такая дэмакратычная сістэма выбараў мала дзе ёсць. «Мы вельмі задаволеныя, што запрошаныя на гэтую работу, глядзім, што ў беларускіх таварышаў ёсць чаму павучыцца, — рэзюмаваў ён. — Малайцы!»

Як звярнуў увагу **незалежны назіральнік з Балгарыі Данізл ПЯТРОЎ**, дагэтуль ён ні разу не ўдзельнічаў у назіранні за выбарамі. «Вашы выбары выключна дэмакратычныя, празрыстыя і яскравыя, — падкрэсліў ён у размове з журналістамі. — Я ўбачыў выбарчую актыўнасць, якой мы ў нашай краіне ніяк не можам дасягнуць».

Міжнародны назіральнік ад МПА СНД, сенатар Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Мікалай УЛАДЗІМІРАЎ у складзе місіі пабываў на некалькіх выбарчых участках у сталіцы і Заслаўі, дзе падрабязна азнаёміўся з ходам галасавання. «На наш погляд, нацыянальнае заканадаўства Рэспублікі Беларусь выкананае, выбарчы працэс праводзіцца ў адпаведнасці з ім, — падкрэсліў назіральнік. — Мы ўбачылі дэмакратычнае і правільнае выкананне ўсіх нормаў».

Таксама ён звярнуў увагу на каларыт галасавання ў рэгіёнах. «Спадабаліся канцэртныя праграмы, тое, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія прыходзілі на выбарчы ўчастак упершыню, атрымлівалі ад членаў камісіі ў падарунак Канстытуцыю», — канкрэтызаваў ён.

Мікалай Уладзіміраў адзначыў высокую арганізацыю выбараў. «Учора мы перадалі першасную інфармацыю, справаздачу і заключэнне Міжпарламенцкай Асамблеі аб правядзенні выбараў, парушэнняў мы не выявілі, — заўважыў ён. — Па закрыцці ўчасткаў мы падрыхтуем выніковае заключэнне і справаздачу нашай місіі, дзе адлюструем усе назіранні, што перададзім беларускаму боку. На бягучы момант парушэнняў не выяўлена, усё праходзіць правільна і дэмакратычна, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Жадаем жыхарам краіны зрабіць правільны выбар і вызначыць сваю будучыню».

Як адзначыў **незалежны назіральнік з Лівана Аднан ЭЛЬ-МАКДАД**, адзіны дзень галасавання ў Беларусі праходзіць у адпаведнасці з Канстытуцыяй нашай краіны, адчуваецца актыўная ўключанасць грамадства ў электаральны працэс. «У якасці назіральніка я быў у многіх краінах, але тым, што ўбачыў у вашай дзяржаве, шакіраваны, — падзяліўся ён. — У Беларусі выбары — гэта не проста выбранне, а свята. Народ усміхаецца. Гэты ўрачысты момант хацелася б выкарыстаць у выбарчай практыцы сваёй краіны».

Вераніка КАНЮТА.

● Брэсцкая вобласць

НАВАСЁЛЫ ВЫБІРАЮЦЬ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Участак № 135 у Брэсце знаходзіцца ў адміністрацыйным будынку парку 1000-годдзя Брэста па вуліцы Грунвальдскай. Гэта новы прыгожы раён, які вырас літаральна за апошнія пяць гадоў. І парк новы, яго пасадзілі ў год, калі Брэст адзначаў міленіум. Стыльныя лаўкі, прадуманы дызайн ландшафту, свежае добраўпарадкаванне — усё разам стварае аблічча гэтай мясціны. А побач з гэтым адміністрацыйным будынкам — летняя кавярня, якая ў дзень выбараў расчыніла свае дзверы ды радуе наведвальнікаў апетытнымі пахамі. З дынамікаў гучаць бадзёрыя песні. І сонца, якога даўно не бачылі гараджане, бліжэй да сярэдзіны дня лагодна выглянула з-за хмар.

Сям'я ЮРЧЫКАЎ.

Не дзіва, што асаблівую актыўнасць выбаршчыкі сталі дэманстраваць а дванаццатай гадзіне.

— У нас вельмі мала выбаршчыкаў сталага ўзросту, — гаворыць **старшыня ўчастковай камісіі Алена ЦЕРАШЧУК.** — Дастаткова сказаць, што па стане на 12 гадзін ніхто не выказаў жаданне прагаласаваць дома. Тут раён новабудоўляў, жывуць адны маладыя сем'і. Вось і зараз многія ідуць у сямейным складзе. Нямала і шматдзетных сем'яў.

«У дамах па вуліцах Грунвальдскай, Екельчыка, Барыса Маслава, якія ўтварылі наш участак, жывуць таксама сем'і ваеннаслужачых, супрацоўнікаў МНС. Яны людзі абавязковыя, многія прагаласавалі датэрмінова. Усяго да ўчастка прыпісаны 1481 выбаршчык. Датэрмінова прагаласавала крыху больш за 40 працэнтаў, — працягвае суразмоўніца. — Участак у нас таксама малады. Гэта другая кампанія ў яго гісторыі, у 2022 годзе мы працавалі на рэферэндуме. І мой другі вопыт у якасці старшыні камісіі таксама. Пакуль усё ідзе ў штатным рэжыме. Дарэчы, перыядычна тэлефануюць людзі і ўдакладняюць па сваім хатнім адрасе лакацыю ўчастка. Апошняе сведчыць, што яны літаральна нядаўна справілі навасэлле».

Менавіта з такімі навасёламі карэспандэнт газеты сустрэлася перад уваходам у памяшканне ўчастка. Дар'я і Кірыл Юрчыкі не так даўно пераехалі ў новую кватэру. На выбары прыйшлі з двухгадовай дачушкай Віталінай. Галава сям'і працуе кіроўцам у транспартнай кампаніі, жонка да дэкрэтнага была служачай.

— Мы вельмі рады, што пасяліліся ў гэтым раёне, — расказвалі, дапаўняючы адно аднаго, сужэнцы. — Навокал уладкавана, прыгожа, праз дзясятак гадоў гэты парк стане зусім цудоўнай мясцінай. Школа і садок блізка, паліклініка цераз дарогу, — усё, што трэба для жыцця, ёсць. Галасуем за мір, спакой, стабільнасць, магчымасці для дзяцей жыць, вучыцца, у далейшым — працаваць.

Сям'я Барзянковых таксама прыйшла на ўчастак у поўным складзе: бацькі Вольга з Вадзімам, васьмігадовая дачушка Ася і чатырохгадовы сын Данііл. Маці сямейства Вольга расказала, што жывуць яны ў сваёй новай кватэры ўжо тры гады:

— Пераехалі сюды з мікрараёна Рэчыца і не нарадуемся. Там мы жылі ў раёне старой забудовы, да цэнтра горада далёка... А тут усё ў крокавай даступнасці, сацыяльная інфраструктура расце і развіваецца на вачах, не кажучы пра эстэтычны выгляд. Мы працуем, карыстаемся сацыяльнымі магчымасцямі ў плане выхавання дзяцей, таму свядома прыйшлі на выбары. А яшчэ вырашылі выкарыстаць пагодны дзень для прыемнай прагулкі, пасля выканання грамадзянскага абавязку маем намер пасядзець з дзецьмі ў кавярні, пачаставацца шашлыком.

Сяргей і Галіна Цэваны прыйшлі з дочкамі Ірынай і Варварай. І пакуль першакласніца Ірына дапамагала бацьку ў тэхнічнай частцы выбарчага працэсу, а менавіта апускала бюлетэні ў скрыню, маленькая Варвара капрызіла, давялося яе маме гушкаць малую на вуліцы.

— Наша Іра вельмі актыўная і ў школе, і дома, — сказаў з усмешкай бацька. — Мы хацелі пазней прыйсці, як меншая паспіць, але старэйшая мабілізавала сям'ю ў першай палове дня. Ну вось прагаласавалі і з адчуваннем выкананага абавязку выпраўляемся дадому.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
фота аўтара.

● Гродзенская вобласць

Будучае для нашчадкаў

Выязная ўчастковая выбарчая камісія завітала ў жаночы манастыр у Гродне пасля завяршэння там нядзельнага набажэнства. Членаў камісіі сустрэла настаяцельніца манастыра ігумення Гаўрыіла і запрасіла... на канцэрт. Удзельнікі дзіцячага і дарослага хору выканалі некалькі музычных кампазіцый, чым стварылі вельмі душэўны і патрыятычны настрой.

Ранішняя служба ў Свята-Раства-Багародзічным стаўрапігіяльным жаночым манастыры завяршылася апоўдні. Некаторыя прыхаджане вырашылі адразу накіравацца на свае выбарчыя ўчасткі, каб выканаць грамадзянскі абавязак. У іх ліку Ірына, якая прыйшла ў храм са сваёй дачкой і пляменнікам. Выбрала гэты дзень не выпадкова, ёй падабаецца асаблівая атмасфера святочнасці, якая пануе на выбарчых участках.

Ірына ў свой час наведвала нядзельную школу пры манастыры, цяпер яе дачка — удзельніца манастырскага хору. Менавіта дзіцячы хор стварыў святочную атмасферу ў пакоі для галасавання, куды прыбыла выязная выбарчая камісія гарадскога ўчастка № 6. Прысутныя былі ўзрушаны галасамі маці і дачкі Дабрушанкаў. У выкананні хору прагучалі як дзіцячыя, так і патрыятычныя песні, якім падпавялі ўсе прысутныя.

Настаяцельніца манастыра ігумення Гаўрыіла, звяртаючыся да дзяцей, прыгадала, як калісьці ў дзяцінстве вельмі зайздросціла дарослым, якія ішлі на выбары. «Так і сённяшнія пяці-шасцігодкі, праз пэўны час таксама стануць дарослымі і будуць выконваць свой грамадзянскі абавязак, а сёння яны сталі сведкамі таго, як гэта робяць іх бацькі. Спадзяюся, што ўсе яны звяжуць лёс са сваёй роднай Беларуссю, як пяецца ў песні, што мы зараз пачулі».

Між тым сакратар участковай выбарчай камісіі ўчастка № 6 Любоў Панасевіч рыхтуе ўсё неабходнае для галасавання ў манастыры. На стале стаіць скрыня, раскладзеныя бюлетэні, падрыхтаваны спіс выбаршчыкаў. Тут іх каля дваццаці чалавек. Ігумення Гаўрыіла дабраслаўляе працэдуру і сама першай ажыццяўляе сваё грамадзянскае права. Затым да галасавання далучаюцца ўсе насельніцы манастыра, святары з сем'ямі.

Пасля настаяцельніца вядзе ў музей, які прысвечаны мітрапаліту Філарэту. З імем першага беларускага Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі тут многае звязана, у тым ліку і сама дзейнасць манастыра, які быў адноўлены 30 гадоў таму. Дарэчы, мітрапаліт Філарэт падчас свайго служэння, на пачатку 90-х гадоў, быў абраны і дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі. Актыўную грамадзянскую пазіцыю займае і настаяцельніца манастыра. Яна — удзельніца трох Усебеларускіх народных сходаў, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне». Яе імя летась занесена ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці.

Вось і на гэты раз манастыр не застаўся ў баку ад электаральнай кампаніі.

— Мы грамадзяне сваёй зямной Айчыны. Як мы можам адштурхнуцца ад таго, што адбываецца побач з намі? Радасці мірскія — нашы радасці, няшчасці мірскія — нашы няшчасці. Бо манастыр, храм — гэта не сцены, гэта людзі. А мы прыйшлі з міру і павінны выконваць наш грамадзянскі абавязак, каб быць годнымі грамадзянамі сваёй Айчыны.

Яна падкрэсліла, што выбары — гэта не фармальнасць, калі чалавек ставіць адзнаку ў бюлетэнь. Гэтым самым чалавек выбірае сваю будучыню. І нават не для сябе, а для сваіх нашчадкаў — для дзяцей, унукаў, праўнукаў. Каб у іх былі сапраўдныя сем'і, была дабрыня, чысціня.

— Таму мы аддаём свае галасы за тых людзей, у якіх верым, што яны за квітнеючую, мірную, свабодную, нашу цудоўную Беларусь. Бо чалавек нараджаецца для таго, каб рабіць дабро, з гэтым настроем мы глядзім у заўтрашні дзень, — рэзюмавала сваю пазіцыю ігумення Гаўрыіла.

Настаяцельніца жаночага манастыра актыўна прапаведуе галоўныя жыццёвыя каштоўнасці — духоўнае выхаванне моладзі і ўмацаванне інстытута традыцыйнай сям'і. Гэта будучае краіны, якому варта паўсюдна ўдзяляць увагу, лічыць яна.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

● Гомельская вобласць

ВЕТЭРАНЫ СУСТРАКАЮЦЬ ГАСЦЕЙ

Са стартам адзінага дня галасавання з восьмай раніцы і да шасці гадзін вечара ў грамадзян, якія па аб'ектыўных прычынах не могуць прыйсці на свой выбарчы ўчастак, прымаюцца заяўкі на арганізацыю надомнага галасавання. Магчымасць прагаласаваць дома даецца толькі ў асноўны дзень выбараў. Для правядзення надомнага галасавання групы прадстаўнікоў выбарчых камісій працуюць на працягу ўсяго дня — з васьмі раніцы да васьмі вечара. Адпрацоўваюцца як заяўкі на галасаванне дома, якія паступілі загадзя, так і тыя, якія паступаюць непасрэдна ў адзіны дзень галасавання.

Галасуе ветэран Вялікай Айчыннай вайны Навум Львовіч КАПЛАН.

Як правіла, па месцы жыхарства галасуюць не проста пенсіянеры, а людзі састарэлага ўзросту. Прагаласаваць лічыць сваім абавязкам ветэран Вялікай Айчыннай вайны Навум Львовіч Каплан. Больш за сорак гадоў жыцця ветэран аддаў службе ў пагранічных войсках. Быў і на Далёкім Усходзе, і на Крайняй Поўначы, а апошнім месцам службы стала сталіца Запаляр'я — Мурманск. З 1982 года Навум Каплан жыве ў Гомелі. Ветэран не прапускае ніводную электаральную кампанію. У свае 97 гадоў і ў дзень адзінага дня галасавання ён таксама поўны рашучасці выканаць свой грамадзянскі абавязак. Навум Львовіч па стане здароўя не змог асабіста прыйсці на ўчастак, таму прагаласаваў дома.

Па месцы рэгістрацыі падпалкоўнік у адстаўцы адносіцца да ўчастка галасавання № 153. Пераносную апламбаваную скрыню па месцы жыхарства ветэрана асабіста даставіў старшыня ўчастковай выбарчай камісіі. Навум Львовіч Каплан прызнаўся, што гасцей чакаў з нецярпеннем. Сустрэў у парадным мундзіры, пры ўсіх узнагародах. Як і на выбарчым участку, так і ў хатняй абстаноўцы, упэўнены ветэран, удзел у выбарах — гэта заўсёды вельмі ўрачысты, хвалюючы момант.

— Мы цэнім, што было зроблена тымі дэпутатамі, якія складуць свае паўнамоцтвы. Спадзяемся на тое, што дэпутаты, якіх выберуць, будуць выконваць волю народа, патрабаванні, якія прад'явіць да іх Прэзідэнт. Я вельмі хачу, каб мы заўсёды былі напагатове! Каб усе былі здаровыя! — пажадаў ветэран.

Заўсёды «быў у страі» і сам прыходзіў на ўчастак для галасавання менавіта ў дзень выбараў жыхар Гомельскага раёна з вёскі Галавінцы, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Трафімавіч Падліпскі. Але цяпер прыхварэў, таму галасуе дома. Аляксандру Трафімавічу ў красавіку споўніцца 101 год.

Яму давялося перажыць акупацыю, быць сувязным у партызанскім атрадзе. У 1943-м — у радах Чырвонай Арміі, удзельнічаў у аперацыі «Багратыён», вызваляў Бабруйск, Мінск. Пасля ранення — ізноў на фронт: штурмаваў Кёнігсберг, сустрэў Перамогу ва Усходняй Прусіі. Аляксандр Трафімавіч адзначыў, як важна, каб не забывалася, колькі было зроблена ў імя свабоды і незалежнасці краіны.

Сам ветэран не па чутках ведае аб тым, якая адказнасць ляжыць на народных абранніках. У свой час больш за дваццаць гадоў Аляксандр Трафімавіч Падліпскі быў дэпутатам Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў.

У Гомельскім раёне надомнае галасаванне арганізавалі для ўдзельніцы Вялікай Айчыннай вайны — Наталлі Еўстратоўскай. Падлеткам усю нямецка-фашысцкую акупацыю роднага раёна яна была сувязной Даманавіцкага партызанскага атрада «Мсціўца». Наталля Ільінічна жыве ў аграгарадку Азарычы Калінкавіцкага раёна, але на зімовы перыяд звычайна пераязджае да дочкі ў вёску Чкалава Гомельскага раёна. Члены Чкалаўскай участковай камісіі № 18 удзельніцу Вялікай Айчыннай вайны наведалі дома. Наталля Ільінічна вельмі хацела ўзяць удзел у галасаванні. Падзялілася, што абавязкова азнаёмілася з інфармацыяй аб усіх кандыдатах у дэпутаты.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

● Віцебская вобласць

Разам з аднавяскоўцамі і сябрамі

У адзіны дзень галасавання на Віцебшчыне працуюць 693 выбарчыя ўчасткі, 17 з якіх — закрытыя. Жыхары паўночнага рэгіёна з самай раніцы бясконцай чарадой спяшаюцца аддаць голас за стабільнасць і росквіт Беларусі. Святочная атмасфера пануе і ў сельскіх выбарчых акругах, у чым на свае вочы ўпэўнілася карэспандэнт «Звязды», калі завітала на Заронаўскі ўчастак для галасавання № 7.

Чырвона-зялёныя сцягі на вуліцы калыша лютаўскі вецер, з неба сыпле дождж. Але гэта не ўплывае на святочны настрой у цэнтры не толькі культурнага, але і палітычнага выхавання аграгарадка — Заронаўскім доме культуры. Яшчэ на падыходзе да выбарчага ўчастка чуваць беларускія напевы, уздоўж будынка туляцца аўтамабілі. Работа кіпіць.

Асаблівасць сельскіх выбарчых участкаў заключаецца ў тым, што тут, у адрозненне ад горада, колькасць зарэгістраваных выбаршчыкаў значна меншая. А гэта значыць, што кожнага жыхара тут ведаюць у твар, чакаюць і пытаюцца аб справах, а калі хто ў кругавароце вясковых спраў забыўся выканаць свой грамадзянскі абавязак, таго запрашаюць прыйсці на ўчастак па тэлефоне. На Заронаўскім участку № 7 зарэгістравана 297 выбаршчыкаў, на апошні дзень датэрміновага галасавання яўка склала 33,6 працэнта.

«Сёння дзве выязныя брыгады ўжо накіраваліся ў аддаленыя вёскі, каб грамадзяне маглі прагаласаваць дома. Папярэдне камісія прымала заяўкі ад людзей пажылога ўзросту і інвалідаў, якія не змогуць прыйсці на ўчастак у адзіны дзень галасавання — гэта каля 15 чалавек. Права аддаць свой голас ёсць у кожнага, таму без увагі ніхто не застанецца», — расказвае **старшыня ўчастковай камісіі Алена ДРАЙЛІХ.**

У ліку тых, хто чакае членаў камісіі дома, — ганаровы грамадзянін Заронаўскага сельсавета, ветэран педагагічнай працы Аляксандр Якімавіч Гушчанка, які палову жыцця ўзначальваў мясцовую школу. Хоць мужчыне ўжо далёка за 90 гадоў, ён заўсёды прымае актыўны ўдзел у электаральных кампаніях, бо ўпэўнены, што ад кожнага з нас залежыць будучыня краіны, у якой жывем мы і будуць расці нашы дзеці. З ім згаджаецца і Таліна Міхайлаўна Іжохіна, якая таксама некалькі дзесяцігоддзяў прысвячала сябе педагогіцы ў Заронаве. Сёлета прыйсці на ўчастак у яе не атрымліваецца з-за галалёду, але члены камісіі абавязкова прыйдуць і да яе.

«Асаблівасцю гэтай выбарчай кампаніі з'яўляецца тое, што на ўчастак прыходзяць цэлымі сем'ямі. Напрыклад, у сям'і Сарокіных трое дарослых дзяцей прывялі бацькоў, у сям'і Зіміных таксама трое дзетак, але яны яшчэ маленькія — бацькі Ганна і Алег на сваім прыкладзе дэманструюць актыўную грамадзянскую пазіцыю. Маладых людзей, для якіх гэтыя выбары першыя ў жыцці, у гэтым годзе няма. Усе яны цяпер вучацца ў вышэйшых навучальных установах, таму галасуюць адпаведна па месцы знаходжання», — працягвае экскурсію Алена Уладзіміраўна.

На гэтым участку выдаюць чатыры бюлетэні, пытанняў у вяскоўцаў не ўзнікае. У кутку выбаршчыка ёсць уся інфармацыя аб кандыдатах у дэпутаты, напярэдадні ў клубе з імі прайшлі сустрэчы. Людзям, якія слаба бачаць, камісія дае лупы. Наяўнасць нізкай кабінкі з крэслам пазітыўна адзначаюць не толькі выбаршчыкі з абмежаванымі магчымасцямі, але і пажылыя. Новаўвядзенне у гэтым годзе стала відэаназіранне і магчымасць у канфліктных сітуацыях скарыстацца трывожнай кнопкай, але патрэбы ў апошнім на ўчастку не было — пачынаючы з 19 лютага тут кругласутачна нясуць варту праваахоўнікі.

Мне ўдалося трапіць на ўчастак, калі пачаўся канцэрт, падрыхтаваны мастацкім калектывам Дома культуры. Адразу настрой стаў бадзёрым, захацелася падпяваць артыстам «Жураўлі на Палессе ляцяць». У фае размясціўся выязны гандаль, таму магчымасцю перахапіць што-небудзь смачненькага вяскоўцы, якія аддалі свой голас, карысталіся з радасцю. Так адзіны дзень галасавання стаў яшчэ адным са свят, якое змагло аб'яднаць людзей, расквеціць шэры лютаўскі дзень.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

● Магілёўская вобласць

ПА БЮЛЕТЭНЬ — З ЗАГСА

Участак для галасавання № 5 па вуліцы Курака ў Магілёве лічыцца рабочым. Ён і размяшчаецца на тэрыторыі металургічнага завода. Акрамя яго работнікаў, сюды прыходзяць галасаваць рабочыя прадпрыемства «Зеніт», швейнай фабрыкі. На тэрыторыі знаходзяцца два вялікія інтэрнаты. Раней яны былі заводскімі, цяпер перайшлі ў камунальную ўласнасць горада. Але жыхары — тыя ж работнікі прадпрыемстваў. Участак адзін з вялікіх у горадзе. Тут галасуе каля 2,4 тысячы чалавек.

Месца для правядзення выбараў пастаяннае, добра вядомае ўсім, хто жыве ў гэтым мікрараёне. Але нават тыя, хто галасаваў тут упершыню, — а такіх было 30 чалавек — не заблукалі. Будынак знаходзіцца побач з аўтамабільнай дарогай.

Выбаршчыкі тут заўсёды актыўныя, шмат хто галасуе датэрмінова. У адных бягучы графік, непасрэдна ў дзень выбараў няма магчымасці прыйсці, другія едуць на выхадныя да родных у вёску. На гэты раз тых, хто прагаласаваў датэрмінова, тут было каля 40 %.

У суботу наогул каля ўчастка прыпыніўся вясельны картэж. Мікіта і Крысціна Дуброўскія адразу ж пасля ЗАГСа адправіліся галасаваць па месцы прапіскі шчаслівага жаніха. Яму ўсяго 19 гадоў, і свой грамадзянскі доўг ён выконваў упершыню.

Асабліва ўрачыста было ў адзіны дзень галасавання. Першыя выбаршчыкі падыходзілі ў хуткім часе пасля адкрыцця ўчастка, але больш масава народ пайшоў пасля 10 гадзін. У першай палове дня невялічкі канцэрт далі ў фае вучні школы № 21 і выхаванцы дзіцячага садка № 65. У будынку па суседстве можна было наведаць буфет.

— Бачна, што выбаршчыкі падрыхтаваныя, у курсе таго, што і як адбываецца, — кажа **старшыня выбарчай камісіі Людміла ЕЛІСЕЕВА.**— Адзіны дзень галасавання — гэта вельмі зручна. Не ўсе, праўда, разумелі, навошта ім замест аднаго бюлетэню давалі тры. І мы тлумачылі, што адначасова выбіраем дэпутатаў у гарадскі і абласны Саветы дэпутатаў, а таксама ў парламент. Што датычыцца ўчастка, то мы, як заўсёды, падрыхтаваліся дасканала. Усё неабходнае для галасавання, у тым ліку лупы, ліхтарыкі, трафарэты і гэтак далей, ёсць. З улікам датэрміновага галасавання ў рабоце задзейнічаныя тры празрыстыя урны.

Людміла Елісеева больш за 30 гадоў на выбарах нязменны старшыня, шмат каго ведае па імёнах, а ў твар наогул ледзь не ўсіх. Тым больш што шмат людзей прыходзіць заводскіх, якія ведаюць яе яшчэ і па партыйнай дзейнасці. Яна член беларускай партыі «Белая Русь».

Па традыцыі народ ідзе галасаваць сем'ямі, шмат хто з маленькімі дзецьмі. Некаторыя перад тым, як апусціць бюлетэнь у урну, падыходзяць да інфармацыйнага стэнда і ўважліва вывучаюць інфармацыю па кандыдатах. Тлумачаць, што хочацца, каб быў чалавек годны. І пра іх заводскі раён не забываў.

Святлана завітала на ўчастак разам з дачкой. Прызналася, што прыходзілася некалькі раз звяртацца да свайго дэпутата і ён дапамагаў.

— Гэта хоць і грамадская пасада, але тут ўсё залежыць ад чалавека, — разважае яна. — Калі ён сумленны і адказны, то з ім можна будзе мець справу. Я сама неяўнадушны чалавек, разумею, як бывае патрэбна дапамога з боку. Тым больш што некаторых з кандыдатаў я ведаю не па расказах, таму і прыйшла прагаласаваць за іх.

Яўген Пенкрат у складзе выбарчых камісій працуе не ўпершыню. Прызнаецца, што самому прыйшлося датэрмінова прагаласаваць, бо жыве ў другім мікрараёне горада. А ў адзіны дзень галасавання ён задзейнічаны ў рабоце камісіі на ўчастку № 5.

— Наша камісія вельмі вопытная і дасведчаная, усё праходзіць цудоўна, — адзначае ён. — Шмат хто датэрмінова прагаласаваў. З раніцы ездзілі са скрынямі да выбаршчыкаў, якія пажадалі прагаласаваць на доме. Гэта ў асноўным пенсіянеры, інваліды. Людзі вельмі адказна ставяцца да сваёй місіі, і ў асноўны дзень выбараў тэлефанавалі і прасілі прыехаць да іх. Толькі ў першай палове дня наведалі 80 чалавек. Працягваем ездзіць пасля абеду, бо заяўкі паступаюць.

На думку Яўгена Пенкрата, прыняць удзел у галасаванні павінен кожны. Дэпутаты — гэта прадстаўнікі ад народа. І імі павінны быць толькі самыя годныя і актыўныя людзі, лічыць ён. Як члена выбарчай камісіі яго радуе, што выбаршчыкі ўдумліва і адказна ставяцца да сваіх абавязкаў.

— Усё арганізавана вельмі добра, выбары праходзяць спакойна, без парушэнняў, — даюць адзнаку выбарчаму працэсу назіральнікі ад металургічнага завода.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Аляксей БЯЛЯЕЎ:

«Выбары павінны быць падзеяй, якую чакаюць»

Як мяркуе дэкан факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксей Бяляеў, нельга збаўляць тэмп інфармацыйнай работы з насельніцтвам пасля выбараў дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы дэпутатаў. Асабліва гэта важна ў кантэксце падрыхтоўкі да будучай электаральнай кампаніі, звязанай з выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Па яго словах, тлумачальная работа павінна весціся пастаянна. «Электаральная кампанія — гэта не толькі і, кажучы прама, не столькі пра выбары, — звярнуў увагу дэкан журфака. — Гэта ўсё-ткі ў цэлым аб нашай палітычнай і грамадскай сістэмах. Электаральная кампанія ідзе заўсёды, калі мы кажам аб дасягненнях і перавагах нашай дзяржавы, аб нашым сацыяльна-эканамічным развіцці».

Кандыдат гістарычных навук заўважыў, што сумесная работа, у тым ліку сродкаў масавай інфармацыі, работа кожнага адказнага грамадзяніна звязана з прасоўваннем гэтых ідэй. Ен адзначыў, што перыядычна павінны праходзіць пэўныя спецыялізаваныя мерапрыемствы, на якіх будзе тлумачыцца сутнасць выбараў, дэмакратычных формаў, па якіх самі выбаршчыкі вызначаюць кіраўніцтва краіны. «Пры гэтым неабходна накіроўваць інтарэсы выбаршчыкаў, — дадаў Аляксей Бяляеў. — Трэба іх знаёміць, калі мы гаворым аб парламенцкіх выбарах, выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў, з гэтымі людзьмі, якія павінны быць на слыху. Яны павінны ўсё сваёй актыўнай дзейнасцю на працягу ўсіх пяці гадоў апраўдваць сваё выбранне, даносіць да сваіх выбаршчыкаў, што зроблена, разбірацца ў праблемах для таго, каб новая выбарчая кампанія не была нечаканым мерапрыемствам. Выбары павінны быць падзеяй, якую чакаюць».

Марына АРЦЁМЕНКА:

«Новая форма электаральнай кампаніі аптымізуе ўсе электаральныя працэсы»

Па словах намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, адзіны дзень галасавання дапамагае выбаршчыку вызначыцца з выбарам, зразумець, хто будзе прадстаўляць яго інтарэсы як у парламенце, так і на ўзроўні мясцовых Саветаў дэпутатаў. Канкрэтна для чалавека гэта вельмі важна, ён на свае вочы бачыць гэтую іерархію, разумее і ўсведамляе яе. Яна падкрэсліла, што Адзіны дзень галасавання апраўданы яшчэ і таму, што выбаршчык, прыходзячы на ўчастак для галасавання адразу, адначасова і ў адным месцы «бачыць» усіх кандыдатаў. Гэта значна аблягчае выбар і дапамагае больш дасканала падысці да яго.

Марына Арцёменка адзначыла, што сёння кожны ўсведамляе: выбары — гэта новы этап у развіцці краіны. Бо новы парламент павінен не толькі захаваць дасягнуты ўзровень сацыяльнага дабрабыту ў грамадстве, але і прапанаваць новыя ініцыятывы, рухацца наперад з улікам пажаданняў насельніцтва.

Мікалай МЫСЛІВЕЦ:

«Адзіны дзень галасавання вызначыць, у якім кірунку мы будзем рухацца далей»

Як падкрэсліў дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікалай Мыслівец, адзіны дзень галасавання з'яўляецца вынікам вялікай работы тэхналагічнага і тэхнічнага плана, змястоўнай падрыхтоўкі Цэнтральнай выбарчай камісіі, органаў улады, абласных і тэрытарыяльных камісій, беларускага электарату. «Пачатак гэтай работы быў закладзены, калі мы сталі актыўна далучаць беларускі электарат у абмеркаванне ўсіх пытанняў, звязаных са зменамі заканадаўства, правядзеннем усялякіх формаў камунікацый з насельніцтвам, — звярнуў увагу эксперт. — Адзіны дзень галасавання — гэта свайго роду прамежкавы вынік гэтай работы, паколькі выбарчая кампанія на гэтым фактычна не заканчваецца. Мы напярэдадні новых выбарчых цыклаў».

Мікалай Мыслівец падкрэсліў, што адзіны дзень галасавання дасць магчымасць падвесці пэўныя вынікі, зрабіць высновы і вызначыць, у якім кірунку мы будзем рухацца далей. «Мы чакаем вынікаў, але, нягледзячы на гэта, працягваем актыўна працаваць», — рэзюмаваў ён.

Аляксей ТАЛАЙ:

«Нельга ляжаць на канапе і чакаць, што ўсё само сабой наладзіцца»

Як чалавек з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, знакаміты паралімпіец, шматразовы рэкардсмен свету і Еўропы звярнуў увагу на надзвычай высокую актыўнасць беларусаў на выбарах. Сапраўды, ужо ў перыяд датэрміновага галасавання яўка выбаршчыкаў перавысіла 40 %, гэта сведчыць аб тым, што людзі разумеюць важнасць сённяшняй выбарчай кампаніі і ролю ў ёй асабіста кожнага. Гэта асабліва важна менавіта сёння, калі на нашу краіну ціснуць, што называецца, з усіх бакоў. Напружаная сітуацыя як непасрэдна на граніцах дзяржавы, так і на дальнім контуры знешняй палітыкі. Па словах Аляксея Талая, у такі няпросты час мы, грамадства, павінны быць мабілізаванымі, а выбары — якраз тое, што даказвае і паказвае нашу еднасць. «Таму ўсе павінны сёння прыйсці на выбарчыя ўчасткі», — зазначыў спартсмен. І дадаў, што там створаны ўсе ўмовы для ўсіх людзей. Так ён, калясачнік, прагаласаваў без аніякіх праблем.

Гаворачы пра спадзяванні беларусаў ад выбараў, ён зазначыў, што сёння людзі адказна ставяцца да выбараў. Трэба на проста ставіць галачкі, але па-сапраўднаму ацэньваць кандыдатаў: іх адукацыю, досвед, кампетэнцыі, грамадскую актыўнасць, здольнасць адпаведна рэагаваць на пэўныя выклікі сучаснасці і разбірацца ў складаных сітуацыях. Гэта трэба рабіць, каб потым нікога не вінаваціць. Увогуле, падкрэсліў Аляксей Талай, шукаць вінаватых — гэта, па сутнасці, пазіцыя ўтрыманцаў, слабых людзей, якія шукаюць дапамогі толькі звонку, а самі нічога не робяць ні для сябе, ні для краіны. І дадаў, што такія паводзіны не ў традыцыі беларусаў, якім за сваю гісторыю неаднойчы давялося адстойваць свае нацыянальныя інтарэсы і суверэнітэт. І сёння, на выбарах, яны таксама робяць гэта.

Наталля КАРЧЭЎСКАЯ:

«Маладым людзям вельмі важна разумець, што яны актыўныя ўдзельнікі жыцця краіны»

Наталля Карчэўская, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, адзначыла, што студэнты яе ВНУ заўсёды адны з самых актыўных. Традыцыйна яны актыўна ўдзельнічаюць у розных акцыях, канцэртах і мерапрыемствах, прымеркаваных да выбараў. «Такім чынам яны ўзмацняюць эмацыянальны складнік гэтай важнай палітычнай падзеі, ствараюць настрой для выбаршчыкаў. Многія нашыя студэнты прагаласавалі датэрмінова, бо сёння яны ствараюць свята для тых, хто галасуе ў адзіны дзень галасавання. Усе адчуваюць агульную святочную атмасферу», — расказала Наталля Карчэўская. Рэктар заўважыла, што моладзь тонка адчувае фальш і няшчырасць, таму ўсе мерапрыемствы ідэалагічнай накіраванасці не праводзяцца па прынцыпе «мерапрыемства дзеля мерапрыемства». Самым яркім праектам яна назвала «Лінію памяці — код вайны». Праект быў рэалізаваны па гранце Прэзідэнта, і ў ім былі задзейнічаны студэнты і выкладчыкі БДУКМ і ўдзельнікі дзіцячых харэаграфічных калектываў. «Гэты праект не прымеркаваны да электаральнай кампаніі. Але ён ідзе ў рэчышчы нашай дзяржаўнай палітыкі па захаванні гістарычнай памяці. І нашым студэнтам, і маладым людзям вельмі важна разумець, што яны актыўныя ўдзельнікі жыцця краіны», — адзначыла Наталля Карчэўская.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:

«Выбарчая кампанія сведчыць аб здольнасці нашых людзей адстойваць свае інтарэсы»

Рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Даніловіч лічыць бягучую выбарчую кампанію важнай у сучасных геапалітычных умовах, якія складваюцца вакол нашай краіны. «Вельмі важна, што гэта кампанія прайшла спакойна, без пэўнага напружання, нейкіх эксцэсаў, — адзначыў ён. — Гэта сведчыць аб тым, што беларускае грамадства зразумела, наколькі важна захоўваць мір, адзінства і спакой, як важна ўдзельнічаць у выбарчым працэсе, выбіраючы сваіх прадстаўнікоў і ў парламент, і ў мясцовыя Саветы. Унікальнасць гэтай кампаніі, вядома, заключаецца ў тым, што ў нас адзіны дзень галасавання, калі выбары сумешчаныя. Гэта вялізная адказнасць і для Цэнтральнай выбарчай камісіі, і для мясцовых камісій, якім даводзіцца працаваць з вялікай колькасцю бюлетэняў».

Па словах Вячаслава Даніловіча, бягучая выбарчая кампанія сведчыць аб згуртаванасці беларускага народа і здольнасці нашых людзей адстойваць свае інтарэсы як унутры краіны, так і ва ўмовах найскладанейшай геапалітычнай абстаноўкі, якая назіраецца ў свеце.

Рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адзначыў: перад новым дэпутацкім корпусам стаяць вельмі адказныя задачы. «У першую чаргу, захаваць мір у нашым грамадстве ва ўмовах узрушэнняў, — падкрэсліў ён. — Трэба як мага больш якасна прадстаўляць інтарэсы тых людзей, якія выбралі нашых дэпутатаў: як мясцовых Саветаў, так і парламенцкага ўзроўню. Зноў выбраныя дэпутаты павінны адчуваць усю меру адказнасці перад сваімі выбаршчыкамі. Есць рэчы, якія неабходна каардынаваць, рэалізоўваць — на заканадаўчым узроўні, і, вядома, на мясцовым узроўні вырашаць тыя праблемы, якія хвалююць выбаршчыкаў канкрэтнай акругі».

Дзмітрый ШАЎЦОЎ:

«Пераможа той, у каго праграма была бліжэй да людзей»

Генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый Шаўцоў сёлета — непасрэдны ўдзельнік электаральнай кампаніі. Ён балаціруецца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Сваімі ўражаннямі ён падзяліўся з журналістамі: «Мне ёсць, з чым параўноўваць, бо да гэтага я двойчы балаціраваўся і працаваў у парламенце ў пятым і шостым скліканнях. Сёлета зусім іншая кампанія. Вельмі спакойная, ніхто не спрабуе падножкі паставіць, абліць брудам. Вельмі важна, калі ёсць магчымасць працаваць спакойна. Сёлета была вельмі камфортная кампанія. Мы плённа працавалі і з нашымі прэтэндэнтамі, і з кандыдатамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. І гэта выдатна. Усе людзі маюць сваю пазіцыю, усе цудоўна разумеюць, навошта яны ідуць у дэпутаты. Гэта вялікая прыступка да развіцця дэпутацкага корпуса краіны», — расказаў Дзмітрый Шаўцоў. Ён прызнаўся, што хваляванне прысутнічае. Але не варта забываць пра класічнае правіла аб тым, што пераможа наймацнейшы. «Пераможа той, у каго праграма была бліжэй да людзей», — заўважыў Дзмітрый Шаўцоў.

Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ:

«Нават адна асоба можа паўплываць на ход гісторыі. А мы сёння выбіраем больш за 12,5 тысячы дэпутатаў»

Мікіта Рачылоўскі, старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, назваў дзень, калі выбіраюць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і дэпутатаў мясцовых Саветаў, сапраўды гістарычным. «Нават адна асоба можа паўплываць на ход гісторыі, а мы сёння выбіраем больш за 12,5 тысячы дэпутатаў мясцовага ўзроўню і больш за 100 парламентарыяў, якія будуць працаваць на карысць нашай дзяржавы на працягу пяці гадоў», — сказаў ён.

Мікіта Рачылоўскі падкрэсліў, што Цэнтральная выбарчая камісія правяла вялікую інфармацыйна-асветніцкую работу. Да гэтага далучыліся палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні. «Мы бачым, як дружна ўсе працуюць. Ніхто не дзеліць моладзь, не стараецца прапіярыцца на гэтай кампаніі, а паказваюць адзінства і кансалідацыю, каб дастукацца да кожнага беларуса», — сказаў ён. Маладзёжным Саветам пры Нацыянальным сходзе на працягу студзеня і лютага быў рэалізаваны праект «Беларусь будучага», у рамках якога прайшлі дыскусійныя пляцоўкі з навучэнцамі і працоўнай моладдзю. У кожным раёне прайшло мінімум тры сустрэчы. «Самае галоўнае, што такія сустрэчы ладзілі не толькі маладыя парламентарыі, дасведчаныя спікеры. Іх праводзілі і маладыя людзі, сярэдні ўзрост якіх 26 гадоў, амаль усе члены Маладзёжнага парламента. З іх 35 з'яўляюцца кандыдатамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў і чатыры чалавекі ідзе ў Палату прадстаўнікоў. Я цалкам перакананы, што па выніках адзінага дня галасавання ў нашага Маладзёжнага парламента будзе прадстаўніцтва як у Палаце прадстаўнікоў, так і па ўсёй краіне ў мясцовых Саветах дэпутатаў. І такім чынам, нашы маладыя парламентарыі, будучы кандыдатамі ў дэпутаты, сустракаюцца з моладдзю, працуюць у фармаце «роўны навучае роўнага», атрымліваюць ад іх зваротную сувязь», — расказаў Мікіта Рачылоўскі.

Меркаванні запісалі Уладзімір ВЯРЭНІЧ, Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.

Нашы фотакарэспандэнты 25 лютага працавалі ў розных куточках нашай цудоўнай краіны — у Салігорску, Кобрыне і Мінску. Але, незалежна ад таго, дзе былі зробленыя гэтыя здымкі, па іх відаць, што ўсюды панаваў пазітыўны настрой. Мяркуйце самі.

АДЗІНСТВА, АДКАЗНАСЦЬ І — СВЯТА

Адзіны дзень галасавання вачыма фотакарэспандэнтаў «Звязды»

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА, Лізаветы ГОЛАД, Кацярыны УРБАН.

Бацькаўшчына адкрываецца ў вершах Багдановіча

У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет новая паэтычная кніга — зборнік вершаў Максіма Багдановіча «Цвяток радзімы васількa».

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Укладальнік вершаванага зборніка — старшыня секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп. Варта нагадаць, што выданне невялікіх памерам паэтычных кніг сучасных паэтаў і класікаў стала добрай традыцыяй у Выдавецкім доме «Звязда». У апошнія гады пабачылі свет зборнікі Анатоля Сыса, Рыгора Барадуліна, Алеся Бадака, Віктара Шніпа, Леаніда Дранько-Майсюка, Таццяны Яцук, Генадзя Бураўкіна, калектыўныя зборнікі паэтаў Берасцейшчыны, Гомельшчыны, Віцебшчыны, Гродзеншчыны.

— Калі мяне запрасілі ўкладаць серыю з творамі класікаў і сучаснікаў, я з вялікай ахвотай пагадзіўся, — расказвае Віктар Шніп. — Мне здаецца, што вялікая колькасць чытачоў мастацкай літаратуры, беларускай кнігі разумее вагу паэтычнага слова, атрымлівае асалоду ад чытання найлепшых узораў паэтычных здабыткаў беларускіх літаратараў. Гэта пацвярджаюць прэзентацыі серыі вершаваных зборнікаў. Дарэчы, знаёмства з выдадзенымі кнігамі, што называецца, «ужывую», адбылося ў Віцебску, Баранавічах, Навагрудку, Мар'інай Горцы... Можна смела меркаваць, што пасля сустрэч паэтаў, супрацоўнікаў выдавецтва з рознымі аўдыторыямі, чытання вершаў і размовы пра паэзію амаратараў мастацкага слова, аматараў паэзіі пабольшала.

У планах Выдавецкага дома «Звязда» — новыя творчыя праекты, звязаныя з беларускай паэзіяй. У бліжэйшы час да чытача прыйдуць вершы Уладзіміра Караткевіча, Еўдакіі Лось, Пімена Панчанкі, Веры Вярбы, а таксама — паэтаў, якія сёння працуюць у айчыннай літаратуры.

Тыраж кнігі Максіма Багдановіча «Цвяток радзімы васількa» — 700 экзэмпляраў. Зборнік можна набыць па ўсёй краіне ў кнігарнях ААТ «Белкніга» і ў кнігарні «Акадэмкніга» ў Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72.

Пра родныя краявіды і іх насельнікаў



«Сляды волатаў» — чарговая навінка ў серыі выдавецтва «Аверсэв» «Сучасная беларуская літаратура», кнігі якой укладаюцца пры падтрымцы Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гэтым разам пад адной вокладкай аб'ядналы творы, у якіх празаікі праз нарысы, апавяданні і казкі расказваюць пра нашу прыроду, пра стасункі чалавека з прыродай.

Літаратура на прыродазнаўчую, экалагічную тэматыку заўсёды прыцягвала ўвагу чытачоў розных узростаў. Мабыць, сёння яна прыцягвае ўвагу чытача асабліва настойліва. Схаваўшыся ад лясоў, рэк, азёр і тым болей балот у прыязную гарадскую зону камфорту, мы ўсё ж кожную сустрэчу з жывой прыродай успрымаем як жаданае адкрыццё. Узімку нас вабяць укрытыя снежнай коўдрай дрэвы, мы здзіўляемся ледзяному покрыву водных артэрый радзімы, захапляемся ўзорамі сняжынак, што ляцяць насустрач нам, нагадваючы зіхатлівыя і недасягальныя зоркі. Ды ці мала сустрэч і адкрыццяў дораць беларускія краявіды не толькі ўзімку, але і летам, восенню, вясною?..

Традыцыяй беларускай літаратуры заўжды было і застаецца апісанне прыродных з'яў, іх мастацкае ўзвышэнне, захапленне стасункамі чалавека з навакольным асяроддзем. Пра вечнасць і бясконцасць прыроды як падараванага нам шчасця існавання ў гармоніі з сонцам і паветрам, з вадою і зямлёю многія беларускія пісьменнікі імкнуліся і імкнуцца сёння распавесці юным чытачам нашай Айчыны. Творы Янкі Маўра, Уладзіміра Дубоўкі, Віталя Вольскага і іншых аўтараў, кожны з якіх абраў разнажанравы падыход да асвятлення ўласных сустрэч з прыродай, складаюць велізарную біліятэку беларускай мастацкай прыродазнаўчай літаратуры. Праходзяць дзесяцігоддзі з часу іх напісання, як у выпадку з «Палескімі рабінзонамі» Янкі Маўра ці «Жоўтай акацыяй» Уладзіміра Дубоўкі, а чытацкая ўвага да гэтых і іншых аповесцяў і апавяданняў не меншае!.. А колькі адкрыццяў дораць нам кнігі Віталя Вольскага «Па лясных сцежках», «У лясах над Бярозай», «Месяц за месяцам», «На бабровых азёрах», «Чайкі над Нараччу», «Родны край», «Дзень добры, Бяроза!»...

Сваімі ўражаннямі ад паходаў у лес, на рэчку, ад сустрэч са звярамі і птушкамі, якія адбываліся на працягу многіх гадоў жыцця, натхнёна дзяліліся ў сваіх кнігах Яраслаў Пархута, Змітрок Бяспалы, Рыгор Ігнаценка... Услухайцеся нават у самі назвы кніг вясковага настаўніка музыкі і спеваў з вёскі Паплавы Бярэзінскага раёна, што на Міншчыне, Рыгора Канстанцінавіча Ігнаценкі: «Лясныя тынкоўшчыкі», «Урок у лесе», «Дзе матылькі зімуюць», «У зімовым садку», «Карабель вясны». Быў час, калі і ў Мінску, і ў Маскве ў перакладзе на рускую мову яны выдаваліся шматтысячнымі тыражамі...

У кнігу «Сляды волатаў» увайшлі творы Алеся Жука, Уладзіміра Ягоўдзіка, Алеся Карлюкевіча. Аўтары вядуць свой дыялог з юным чытачом, звяртаючыся да тых ці іншых з'яў прыроды, да тых ці іншых насельнікаў лясоў і балот, да вобразаў і паводзін птушак і звяроў нашай роднай старонкі.

Нагадаем, што «Сляды волатаў» — восьмая кніга серыі «Сучасная беларуская літаратура». Наступны зборнік будзе прысвечаны сучаснай рускай прозе Беларусі, назва кнігі — «Игла в квадрате». Яе аўтары — вядомыя ў краіне Алег Ждан, Вера Зелянко, Валянціна Драбышэўская, Анатоль Матвіенка, Сяргей Трахімёнак.

Сяргей ШЫЧКО.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.06	18.39	10.33
Віцебск —	7.58	18.27	10.29
Магілёў —	7.57	18.29	10.32
Гомель —	7.51	18.28	10.37
Гродна —	8.21	18.55	10.34
Брэст —	8.19	18.58	10.39

Месяц

Поўня 24 лютага.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Веры, Ганны, Зоі, Святланы, Васіля, Георгія, Лявона, Мікалая, Паўла, Сцяпана, Сямёна.*
К. *Эльвіры, Аляксандра, Міраслава, Піліпа.*

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Навукоўцы высветлілі, што веганы жывуць на 15 % даўжэй.
— Чым астатнія?
— Чым меркавалася...

Назваў дзяўчыну-астранома сонейкам, а яна пакрыўдзілася: сказала, што ў свеце процьма ярчэйшых зорак і што я з ёй толькі таму, што яна бліжэй за іншых.

Фісташкі — гэта вусцрыцы для веганаў...

— Пустата нейкая ўнутры...

— Ты са сваімі дыетамі задзяўбла ўжо! Скадзі і паеш, толькі не ный.

За што не люблю вегетарыянцаў, дык гэта за тое, што яны ядуць ежу маёй ежы.

26 ЛЮТАГА Даты Падзеі Людзі

У краіне

1912 год — нарадзіўся Уладзімір Барысавіч Карпаў, беларускі пісьменнік. Аўтар раманаў «За годам год», «Вясновыя ліўні», «Нямігі крывавыя берагі» і іншых. Укладальнік і адзін з аўтараў кнігі «Мы раскажам пра Мінск».

1929 год — нарадзіўся Георгій Данілавіч Колас (в. Куцень Чэрвеньскага раёна), беларускі крытык, публіцыст, драматург. Аўтар кнігі «Сучаснікі ў грыме і без грыму», зборніка артыкулаў «Дыялог праз рампу», брашур па пытаннях драматургіі і тэатральнага мастацтва, сцэнарыяў дакументальных, навукова-папулярных кіна- і тэлефільмаў («Беларуская сюіта», «Купалаўцы», «Іван Шамякін» і іншых).

У свеце

1802 год — нарадзіўся Віктор Мары Гюго, французскі пісьменнік, адна з галоўных фігур французскага рамантызму, палітычны і грамадскі дзеяч. Аўтар кніг «Сабор Парыжскай Божай маці», «Адрынутыя» і іншых.

1829 год — нарадзіўся Лівай Страус, амерыканскі прадпрымальнік, стваральнік джынсаў. Ён пачаў вывучаць гандлёвы бізнес і ў 1848 годзе з'ехаў у Кентукі, дзе працаваў коміваяжорам — гандляваў галантарэяй і інструментамі. У 1849 годзе ў Каліфорніі былі адкрытыя радовішчы золата. Пачалася залатая ліханаманка. На Заходняе ўзбярэжжа ЗША пацягнуліся тысячы людзей. У 1853 годзе Страус прывёз чарговую партыю тавару ў Сан-Францыска. Увесь тавар быў раскуплены з карабля яшчэ да заходу ў порт. Засталася толькі канапляная парусіна. Страус замовіў у краўца штаны з гэтай тканіны. Іх імгненна раскупілі. У 1853 годзе Страус заснаваў фірму «Levi Strauss & Co.». Замест канапляных парусінь штаны пачалі шыць з мякчэйшай французскай тканіны, якую звалі «дэнім» (гэта значыць, з горада Ім у Паўднёвай Францыі, дзе гэтая тканіна першапачаткова выраблялася).

1869 год — нарадзілася Надзея Канстанцінаўна Крупская, савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, ганаровы член АН СССР, доктар педагагічных навук. Жонка У. І. Леніна. З 1929 года — намеснік наркама асветы РСФСР, з 1920-га — старшыня Галоўпалітасветы пры Наркамасветы. Распрацоўвала прынцыпы савецкай сістэмы адукацыі. Аўтар работ па педагогіцы і ўспамінаў пра У. І. Леніна.

1917 год — у нью-ёркскай студыі фірмы «Victor» запісана першая джазавая пласцінка. З гэтага часу пачалося паступовае распаўсюджванне джаза спачатку ў ЗША, а потым і ў іншых краінах свету.

Так гаварыў...

МАЦІ ТЭРЭЗА:

«Любоў і спачуванне — гэта сапраўдная сіла. У канчатковым выніку яны заўсёды перамагаюць».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.985. Індэкс 63850. Зак. № 378.

Нумар падпісаны ў 19.30

25 лютага 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12